*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

*I. A. Sorokovik*
Academy of management under the President
of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 34.01(091)(476):37**

# ПАЧАТКОВАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ БЕЛАРУСІ Ў 1920–1930-Я ГАДЫ

# FIRST-STEP OF JURIDICAL EDUCATION IN BELARUS IN 1920–1930 YEARS

*Артыкул прысвечаны арганізацыі і развіццю пачатковай юрыдычнай адукацыі Беларусі ў 1920–1930-я гг. Падрыхтаваны на аснове архіўных матэрыялаў, многія з якіх упершыню ўведзены ў навуковы зварот.*

*Ключавыя словы: Беларусь; юрыст; адукацыя; пачатковы; універсітэт; кадры; нарка.*

*The article deals organization and development of first-step of juridical education in Belarus in 1920–1930 years. The article is based on archived materials, which are published at first time.*

*Key words: Belarus; lawyer; education; elementary; University; human resources; people's Commissariat; justice; students; teachers; courses.*

Пытанням станаўлення і развіцця юрыдычнай адукацыі ў Беларусі прысвяцілі свае працы многія айчынныя даследчыкі. У разглядаемы перыяд з'явіліся работы С. Я. Вальфсона, С. З. Каценбогена, У. І. Пічэты, Ф. Ф. Турука. У гады незалежнасці Беларусі ўбачылі свет брашура дактароў юрыдычных навук, прафесараў А. І. Юхо і С. Ф. Сокала «История юридической науки Беларуси» (2000) і кніга Л. П. Максімавай «Alma mater юристов Беларуси: история и современность юридического факультета Белорусского государственного университета» (2001). Гэту праблему на тэрыторыі краіны разглядалі ў асобных публікацыях С. А. Балашэнка, Г. Я. Галенчанка, Т. І. Доўнар, І. У. Вішнеўская, М. У. Сільчанка, В. Ф. Шалькевіч і іншыя даследчыкі. Аднак у іх працах увага надавалася найперш юрыдычнай адукацыі ў БДУ, і многія даваенныя і архіўныя крыніцы не былі выкарыстаны. Таму аўтар вырашыў запоўніць гэты прабел з улікам дасягнутага папярэднікамі.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта і Полацкай езуіцкай акадэміі царскім урадам вышэйшая адукацыя ў Паўночна-Заходнім краі, у тым ліку юрыдычная, перастала існаваць. І беларускія юнакі адпраўляліся найперш у Пецярбург, Маскву, Варшаву, Кіеў, Харкаў, Адэсу для яе атрымання.

Неаднаразовыя звяртанні эліты беларускага грамадства да імперскага ўрада з просьбай адкрыцця вышэйшай школы ў краі станоўчых вынікаў не прынеслі [1, с. 179–180]. Адсутнасць вышэйшай школы ў краі не спрыяла развіццю і пачатковых навучальных устаноў, уключаючы юрыдычныя.



З утварэннем Беларускай Народнай Рэспублікі праводзілася падрыхтоўчая праца для адкрыцця Беларускага ўніверсітэта ў Мінску [2, с. 385].

Толькі з утварэннем ССРБ пачалася рэальная праца па адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якое адбылося 11 ліпеня 1921 г. [4]. Яго рэктарам стаў прафесар У. І. Пічэта, намеснікам рэктара па акадэмічных справах – прафесар В. Н. Іваноўскі, намеснікам рэктара па адміністрацыйных справах – прафесар С. З. Каценбоген [5, с. 233].

З утварэннем БДУ было адкрыта прававое аддзяленне на факультэце грамадскіх навук, дэканам якога быў прызначаны У. М. Ігнатоўскі, намеснікам дэкана – С. Я. Вальфсон, сакратаром – А. Н. Вазнясенскі. На аддзяленні былі адкрыты крымінальны, цывільны, дзеючага заканадаўства РСФСР і судовай медыцыны кабінеты [3, с. 132].

Нязначны выпуск спецыялістаў прававога аддзялення БДУ, павелічэнне тэрыторыі Беларусі за кошт вяртання значнай часткі ўсходняй этнічнай тэрыторыі беларусаў, патрэбнасці дзяржаўных устаноў БССР, асабліва праваахоўных, паставілі на парадак дня неабходнасць арганізацыі падрыхтоўкі юрыдычных спецыялістаў пачатковага ўзроўню. Пэўны выхад быў знойдзены ва ўтварэнні кароткатэрміновых юрыдычных курсаў.

У сістэме Наркамата юстыцыі БССР яны ўпершыню ўпамінаюцца з 24 снежня 1925 г., калі НКЮ БССР за № 6714 быў накіраваны ліст у Наркамат асветы Беларусі для зацвярджэння «Палажэння пра кароткатэрміновыя юрыдычныя курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы нізавых работнікаў юстыцыі». Мэта – падняць кваліфікацыю нізавых судова-следчых і пракурорскіх работнікаў у галіне савецкага права. Прадаўжальнасць курсаў – 6 месяцаў. Курсы прадвызначаліся:

- для асобаў, якія праслужылі ў судовых органах не менш за адзін год у пасадзе не ніжэй народнага суддзі, следчага або памочніка пракурора;
- для рабочых і сялян, якія прапаноўваліся савецкімі, партыйнымі і прафесіянальнымі арганізацыямі на судовую працу.

На курсы слухачы павінны былі камандзіравацца акруговымі партыйнымі камітэтамі, акруговымі выканкамамі, праўленнямі прафсаюзаў, акруговымі судамі, пракурорамі і Наркаматам юстыцыі па развёрстцы наркамата. Значыць, гэта павінны былі быць асобы, якія прайшлі сіта адбору праз партыйныя, савецкія, грамадскія арганізацыі і быць на баку савецкай улады.

Тым не менш усе, хто прыходзіў на курсы, падвяргаліся калоквіуму па палітычнай грамаце і савецкаму праву і павінны былі задавальняць наступным умовам:

«а) быць граматнымі, мець узрост не менш за 18 гадоў для жанчын, а для мужчын, апрача таго, адбыць абавязковую вайсковую службу або мець пасведчанне пра вызваленне ад яе;

б) быць знакомымі з асновамі палітграматы» [6].

Паступіўшыя абавязаны былі даць падпіску праслужыць у сістэме Наркамата юстыцыі БССР не менш за два гады.

Кіраванне курсамі выглядала дэмакратычным, бо ўскладалася на загадчыка, які прызначаўся НКЮ БССР па ўзгадненні з Галоўпрафобрам і саветам з прадстаўнікоў НКЮ, Галоўпрафобра, ВЦСПС, факультэта права і гаспадаркі і трох прадстаўнікоў ад слухачоў.

Праграма курсаў была насычана юрыдычнымі дысцыплінамі і асновамі палітычных. Яна ўключала ў сябе асновы марксізму-ленінізму, дзяржаўнае ўладкаванне СССР і БССР, крымінальнае права і крымінальны працэс, грамадзянскае права і грамадзянскі працэс, працоўнае права, зямельнае і лясное заканадаўства, сямейнае права, а таксама беларускую мову ў сувязі з правядзеннем РКП(б) палітыкі карэнізацыі. Перавага ў выкладанні была аддадзена практычным, а не лекцыйным заняткам [7].

11 студзеня 1926 г. нарада пры Галоўпрафасветы Беларусі ўнесла змены ў Палажэнне пра курсы: прымаць на вучобу без іспытаў працаўнікоў судовых устаноў, а таксама мець узрост не менш за 21 год. Ставілася задача «распрацаваць навучальны план, вызначыць настаўнікаў і прапанаваць ім скласці праграму прадметаў» [8].

Толькі 15 красавіка 1926 г. праграма курсаў была зацверджана Наркаматам юстыцыі БССР. У адпаведнасці з ёй на прадметы адводзілася наступная колькасць гадзін: грамадзянскае права – 100 гадзін, грамадзянскі працэс – 60, крымінальнае права – 70, крымінальны працэс – 40, зямельнае і лясное права – 30, працоўнае права – 25, шлюбнае і сямейнае права – 20; асновы судаўладкавання – 16: а) пракуратура – 15, б) натарыят – 15, в) калегія абаронцаў – 4, пенітэнцыярная справа – 15; тэхніка дазнання і следства – 40, дзяржаўнае права – 30; палітграмата: а) гісторыя партыі – 26, б) асновы ленінізму – 30; беларуская мова – 120. Усяго 700 гадзін.

У якасці лектараў былі запрошаны 26 чалавек, у тым ліку М. А. Сегал, Немытых, С. Энднерал, Пастрайтэр, С. М. Гохман, Нестэр, Карачык, Баранаў, Цітовіч, Зыбко, Ф. І. Гаўзе, Шапіра, Штаер, Сіраценка, Глезераў, Цэйтлін, Ватацы і інш. У асноўным гэта былі супрацоўнікі Наркамата юстыцыі БССР, праваахоўных органаў рэспублікі [11].

6 мая 1926 г. курсы дысцыплін былі размеркаваны паміж выкладчыкамі, а 14 чэрвеня гэтага ж года нарада пры Аддзеле судабудаўніцтва і нагляду НКЮ прапанавала зацвердзіць загадчыкам курсаў старшага інспектара гэтага аддзела Папова, а ў Савет курсаў – ад НКЮ Энерала, Галоўпрафасветы – Багданава, ВЦСПС – Шапіра, БДУ – прафесара М. О. Грэдынгера. Выкладчыкамі былі зацверджаны 32 чалавекі. Загадчыку курсаў было даручана дамовіцца са сталоўкай аб водпуску слухачам абедаў па льготных цэнах. «Спробна-прыёмная камісія» была ўтворана з пяці чалавек: Папова, Несцера, Карначова, Курачкіна і Шапіра. У выніку яе працы склад курсантаў склаў 60 чалавек. З іх 20 было судовых работнікаў, 10 – пракурорскіх і следчых, 30 – іншых.

Кароткатэрміновыя юрыдычныя курсы афіцыйна былі адкрыты 1 ліпеня 1926 г., а вучэбныя заняткі пачаліся 5 ліпеня. Характэрна, што яны



праводзіліся ва ўстанове з 8.00 да 10.00, а затым з 18.00 да 21.00 і нават да 22.00. Усе слухачы былі размеркаваны на восем груп для праходжання практычных заняткаў у адпаведных органах г. Мінска з такім разлікам, каб кожныя два тыдні працавалі ў адной установе з 12.00 да 16.00 у наступным парадку: акруговы суд, пракуратура, следчая частка, калегія абаронцаў, натарыят, судовы выканаўца, справаводства, народны суд. Пры тым для кожнай вучэбнай групы мянялася чарговасць такім чынам, каб у адным месцы знаходзілася толькі адна група [12].

Камандзіраваныя асобы акруговымі судамі і пракурорамі атрымлівалі 20 руб. у месяц, а партыйнымі і іншымі органамі – 10 руб. 50 кап. За гэтыя грошы прахарчавацца ў г. Мінску было складана, таму назіраліся пропускі заняткаў. Як адзначана ў адным з лістоў кіраўніка курсаў Папова ў НКЮ БССР, «слушатели жили в самой крайней нужде, в последние дни недоедание стало бытовым явлением» [13].

Характэрны партрэт складу слухачоў: на верасень 1926 г. на курсах займалася 72 чалавекі, з іх па ўзросту: да 25 гадоў – 25 %, да 30–55 %, больш за 30–18 %; па нацыянальнаму складу: беларусаў – 44–61 %, яўрэяў – 20–27 %, вялікарусаў – 5–6,9 %, іншых – 2–2,7 %; па сямейнаму становішчу: сямейных – 33–45,84 %, адзінокіх – 39–54,15 %; па адукацыі: сярэдняя – 26–36,1 %, нізшая – 40–55 %, хатняя – 5–6,94%; па сацыяльнаму становішчу: рабочых – 23–30,55 %, сялян – 31–43 %, служачых – 18–25 %; па партыйнасці: сяброў КПБ – 26–36,1 %, кандыдатаў у КПБ – 8–11 %, сяброў ЛКСМБ – 10–13,9 %, беспартыйных – 27–37,5%; па стану: мужчын – 57–79,1 %, жанчын – 15–20 %; па працы: народных суддзяў – 13–18 %, сакратароў – 6–8,3 %, практыкантаў і следчая праца – 4–5,5 %, іншых – 48–65,6 %; камандзіраваных: акрсудом – 20–27,7 %, акрпракурорам і пракуратурай – 4–5,5 %, партыйнымі, савецкімі і іншымі органамі – 33–45,8 %, нікім – 14–19,4 %; марксісцкая падрыхтоўка: школа – 9–12,5 %, самаадукацыя – 43–59,7 %, ніякай – 19–26,9 %; грамадская праца: займаецца – 51–70,8 %, не займаецца – 20–27,7 % [14].

Значыць, «сярэдні» слухач меў 25–30 гадоў, у асноўным быў беларусам, меў пачатковую адукацыю, сялянска-рабочага паходжання, у асноўным мужскога полу, не працаваў у юрыдычных установах, займаўся палітычнай самаадукацыяй і грамадскай працай. Менавіта апошняе і сялянска-рабочае паходжанне мелі галоўнае значэнне пры накіраванні асобаў на кароткатэрміновыя юрыдычныя курсы.

Уражвае нізкі ўзровень адукацыі сярод слухачоў курсаў, і гэта пасля не менш шасці гадоў савецкай улады, калі шырока былі адкрыты магчымасці для яе атрымання. Толькі трэцяя частка з іх мелі сярэднюю, а астатнія – пачатковую і хатнюю. Нават судовыя работнікі не мелі элементарнай юрыдычнай падрыхтоўкі і мінімальнага стажа практычнай працы. Усё вырашалі «рэвалюцыйная законнасць» і «рэвалюцыйная мэтазгоднасць». Зразумела, чаму НКЮ БССР быў вельмі зацікаўлены ў адкрыцці хаця б кароткатэрміновых

юрыдычных курсаў, бо прававое аддзяленне БДУ не магло за кароткі тэрмін сур'ёзна дапамагчы ў вырашэнні гэтай кадравай праблемы.

Нацыянальны склад не ў поўнай меры адлюстроўваў этнічнае становішча ў рэспубліцы. Высокі працэнт яўрэяў тлумачыцца тым, што ў параўнанні з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў у іх быў больш высокі адукацыйны ўзровень. Больш за тое, да рэвалюцыі сярод гарадскога насельніцтва Беларусі яўрэі складалі большасць, па сведчанні некаторых даследчыкаў, ад 60 % да 80 %. А горад – цэнтр не толькі адміністрацыйны і эканамічны, але і духоўны. Менавіта ён прэзентуе найбольш актыўную частку ўсяго насельніцтва. Беларусы ў сваіх гарадах былі толькі на чацвёртым месцы.

Сацыяльнае становішча слухачоў таксама не адпавядала рэспубліканскаму. Працэнт рабочых быў мізэрны, не дасягаў і 7–8 %, а сярод тых, хто вучыўся, у чатыры разы больш. Такі класавы падыход адпавядаў мэтам і задачам партыі бальшавікоў ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, якая разглядала рабочых як сваю галоўную палітычную апору.

У працы курсаў не ўсё складвалася добра. Не было спецыяльных памяшканняў для заняткаў, неабходнага абсталявання, свайго інтэрната для слухачоў. Праблемы былі з вучэбнай літаратурай, хоць існавала пэўная дамоўленасць з бібліятэкай БДУ. Улічваючы, што лектарамі, як правіла, з'яўляліся практычныя работнікі як з Наркамата юстыцыі, так і з іншых цэнтральных органаў улады і кіравання рэспублікі, з-за сваёй загружанасці асноўнай працай яны часам не маглі праводзіць заняткі. У сувязі з гэтым праграма вучобы была скарочана больш чым на 100 гадзін [15]. Тым не менш працу першых кароткатэрміновых юрыдычных курсаў можна ацаніць станоўча. 60 практычных работнікаў завяршылі іх паспяхова, атрымалі асновы ведаў па галінах права, а галоўнае – пазнаёміліся з вопытам працы сваіх калег-прафесіяналаў у Мінску.

Пытанні арганізацыі і працы кароткатэрміновых курсаў перыядычна разглядаліся на пасяджэннях НКЮ БССР. Адно з іх адбылося 4 лютага 1927 г. пад старшынствам наркама М. А. Сегала. Дакладваў Энерал. З яго выступлення бачна, што супрацоўнікі Наркамюста прадугледзелі недахопы ў правядзенні першых курсаў. Таму загадзя вызначылі памяшканне для іх, прызначылі загадчыка. На курсы меркавалася запрасіць 24 супрацоўнікаў суда, 12 – пракуратуры і следчых органаў, 12 – прадстаўнікоў ад акруговых выканкамаў і грамадскіх арганізацый, 10 – супрацоўнікаў НКУС і 7 месц пакінуць у рэзерве. Усяго 65 чалавек. Стыпендыя ўстанаўлівалася для 25 чалавек у памеры 20 руб. у месяц. На заняткі адводзілася 880 гадзін. Выкладчыкі за адну гадзіну працы павінны былі атрымоўваць 50 кап. [16].

Калі першы выпуск паспяхова завяршылі 60 чалавек, то другі ў 1927 г. – 62. З іх членам акруговага суда накіравалі аднаго выпускніка, намеснікам акруговага пракурора – 1, народнымі суддзямі – 31, памочнікамі пракурораў – 14, судовымі выканаўцамі – 2, народнымі следчымі – 9, членам калегіі абаронцаў – 1, сакратарамі – 13, справаводамі – 3 [17]. Гэтыя звесткі сведчаць, што праблема падрыхтоўкі юрыдычных кадраў заставалася складанай, калі нават на пасады акруговага суддзі, намесніка акруговага пракурора, народнага суддзі, памочніка пракурора НКЮ БССР вымушаны быў накіроўваць асоб, якія закончылі толькі кароткатэрміновыя юрыдычныя курсы. Пра сярэднюю і вышэйшую юрыдычную адукацыю гаварыць не прыходзілася. З гэтага можна меркаваць і пра якасць выканання законнасці на месцах.



19 лютага 1927 г. нарада пры Аддзеле судабудаўніцтва і нагляду НКЮ БССР разглядала пытанні вучэбнага плана і праграмы новых курсаў. Вучэбны план быў разлічаны на 850 гадзін, у тым ліку планавалася адвесці на беларускую мову 120 гадзін, дзяржаўнае права – 25, агульную тэорыю права – 25, асновы ленінізму і гісторыю партыі – 80, крымінальнае права – 120, грамадзянскае права – 150, крымінальны працэс – 110, грамадзянскі працэс – 110, зямельнае і лясное права – 30, працоўнае права – 25, асновы судабудаўніцтва – 30, тэхніку справаводства – 15, статыстыку – 10 гадзін [18]. Станоўча, што прэваліравалі, як бачна, юрыдычныя дысцыпліны.

Асобы, якія закончылі кароткатэрміновыя юрыдычныя курсы, размяркоўваліся на працу як непасрэдна Народным камісарыятам юстыцыі БССР, так і іншымі органамі, якія іх накіроўвалі на вучобу. Так, 13 снежня 1927 г. прэзідыум Аршанскага акруговага выканаўчага камітэта размеркаваў курсантаў, якія закончылі юрыдычныя курсы пры НКЮ БССР, у якасці народных суддзяў на 1, 5, 8, 9, 10, 14 і 15 участкі акругі [19].

23 жніўня 1929 г. калегія НКЮ БССР, заслухаўшы т. С. Гохмана (намесніка наркама) пра арганізацыю гадавых юрыдычных курсаў, вырашыла пачаць іх працу з 1 кастрычніка 1929 г., так як СНК БССР толькі тады адпусціць сродкі на іх арганізацыю. На курсах неабходна было арганізаваць дзве групы: «Для вылучэнцаў з рабочых прадпрыемстваў і батракоў, і для перападрыхтоўкі тых, якія ўжо вылучаны і працуюць у судовых органах, але не маюць належнай адукацыі» [20].

Архіўныя матэрыялы пакуль не дазваляюць прасачыць дзейнасць гэтых курсаў пасля 1929 г. Магчыма, гэта звязана з рэарганізацыяй БДУ і адкрыццём Інстытута савецкага будаўніцтва і права пры ЦВК БССР, а таксама з заснаваннем юрыдычнай школы. Канчаткова сцвярджаць пра гэта нельга, бо не выяўлены адпаведныя нарматыўныя прававыя акты. Наогул, сведчанні Нацыянальнага архіва Беларусі за 1930-я гг. вельмі скудныя, асабліва праваахоўных устаноў рэспублікі.

Тым не менш з загада № 369 па Пракуратуры БССР ад 15 ліпеня 1938 г. за подпісам намесніка пракурора Гукава бачна, что 6 чалавек закончылі трохмесячныя юрыдычныя курсы пры НКЮ БССР і былі назначаны на пракурорска-следчую працу ў раёны Беларусі на пасады следчага, выконваючага абавязкі пракурора і памочніка пракурора, а 16 ліпеня гэтага ж года яшчэ

13 чалавек, якія закончылі гэтыя курсы, былі накіраваны на пракурорска-следчую працу ў розныя раёны рэспублікі [21].

Наступныя трохмесячныя юрыдычныя курсы ўжо пры Пракуратуры БССР абвяшчаліся загадам № 583 пракурора Новіка ад 15 кастрычніка 1938 г. у адпаведнасці з указаннямі Пракурора СССР А. Я. Вышынскага аб іх арганізацыі для перападрыхтоўкі пракурорскіх работнікаў з 20 кастрычніка 1938 г. па 20 студзеня 1939 г. Для ўдзелу ў іх Мінская і Гомельская вобласці павінны былі накіраваць па 10 пракурорскіх работнікаў, Магілёўская – 12, Віцебская – 11, Палеская – 8 [22].

Гэтыя факты даюць магчымасць выказаць меркаванне аб тым, што і пасля 1929 г. маглі працаваць кароткатэрміновыя юрыдычныя курсы, хоць дакладных звестак у фондах наркаматаў юстыцыі, унутраных спраў, Пракуратуры БССР пра іх не выяўлена. Магчыма, гэтыя звесткі ёсць у маскоўскіх архівах.

Такім чынам, патрэбнасці дзяржаўных органаў Беларусі ў міжваенны перыяд і абмежаваныя магчымасці вышэйшай юрыдычнай адукацыі рэспублікі патрабавалі ад органаў улады і кіравання БССР прыняцця дадатковых мер, накіраваных на задавальненне гэтых патрэб. Пашырэнне прававога навучання было выклікана і тым, што на гэты час, асабліва на 30-я гг., прыходзілася хваля масавых рэпрэсій, якая закранула і юрыдычныя кадры. Таму замест выбыўшых патрабаваліся новыя. Адным з кірункаў стала падрыхтоўка юрыдычных кадраў праз кароткатэрміновую юрыдычную адукацыю. З апошняй чвэрці 1939 г. быў павялічаны набор абітурыентаў на такія курсы і ў сувязі з павелічэннем тэрыторыі рэспублікі за кошт далучэння да БССР Заходняй Беларусі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Турук, Ф. Ф.* Университетская летопись / Ф. Ф. Турук // Труды Белорусского государственного университета в Минске. – Минск: Гос. изд-во Белоруссии, 1922. – № 1. – С. 175–207.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993. – Т. 1: А – Беліца.– 494 с.
3. *Пічэта, У. І.* Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым / У. І. Пічэта // Працы Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсітэту ў Менску. – № 19. – Менск: Выд. Праўленьня БДУ, 1928. – С. 3 – 19.
4. Савецкая Беларусь. – 1921. – 13 ліп.
5. *Каценбоген, С. З.* Белорусский государственный университет / С. З. Каценбоген // Працы беларускага дзяржаўнага ўнівэрсітэту. – Менск: Выд. Праўлення БДУ, 1923. – № 4–5. – С. 230–281.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 99. – Воп. 2. – Спр. 293. – Арк. 1,7.
7. Там жа. – Арк. 9.
8. Там жа. – Арк. 10.
11. Там жа. – Арк. 31, 34.
12. Там жа. – Арк. 35, 39, 144.



13. Там жа. – Арк. 96, 97, 289.
14. Там жа. – Арк. 248–248 аб.
15 Там жа. – Арк. 287.
16. Там жа. – Спр. 340. – Арк. 3, 6–7.
17. Там жа. – Спр. 567. – Арк. 81.
18. Там жа. – Спр. 646. – Арк. 1, 23.
19. Там жа. – Спр. 1374. – Арк. 81.
20. Там жа. – Спр. 710. – Арк. 7.
21. Там жа. – Фонд 750. – Воп. 1. – Спр. 691. – Арк. 89–91.
22. Там жа. – Арк. 195–197.
23. Праграма юрыдычнага мінімума для адказных работнікаў органаў юстыцыі. – Менск: НКЮ БССР, 1934. – 16 с.
24. НАРБ. – Фонд 750. – Воп. 1. – Спр. 689. – Арк. 12.

**(Дата подачи 20.02.2015 г.)**

*К. Л. Снисаренко*
Белорусский государственный университет, Минск
*K. L. Snisarenko*
Belarusian state university, Minsk

**УДК 325.14(44)(091)«1997/2002»**

## ИММИГРАЦИОННАЯ ПОЛИТИКА КАБИНЕТА ПРЕМЬЕР-МИНИСТРА Л. ЖОСПЕНА ВО ФРАНЦИИ В 1997–2002 ГГ.

## IMMIGRATION POLICY PRIME MINISTER'S OFFICE L. JOSPIN IN FRANCE IN 1997–2002 YEARS

*В статье характеризуется иммиграционная политика французского правительства премьер-министра Л. Жоспена. В целом успешные ее результаты омрачались тем фактом, что левой коалиции не удалось утвердить свой подход к решению проблемы иммиграции.*
*Ключевые слова: Франция; иммиграция; политическая борьба; государственная политика.*

*The author gives a description of the immigration policy of the French government, led by the Prime Minister L. Jospin. In general, its successful results were overshadowed by the fact that the left coalition failed to adopt its approach to the problem of immigration.*
*Key words: France; immigration; political struggle; public policy.*

С начала 1990-х гг. иммиграционная политика стала одним из важных направлений деятельности французских правительств. Главной ее целью было решение иммиграционного вопроса, связанного с восприятием французским обществом и политическим истеблишментом иммиграции как проблемы. Предпосылками возникновения иммиграционного вопроса стали изменения в процессе иммиграции в страну, которые проявились после решения французских властей ограничить внешнюю трудовую мигра-